Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, ПРАФКОМАЎ, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА
ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

№ 27 (125) Серада, 10 студзеня 1990 года

ТЭЛЕТАЙП

Адбылася канферэнцыя калектыву Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы па вылучэнню кандыдатаў у Вярхоўны Савет БССР і мясцовыя саветы.

У выніку адкрытага галасавання большай колькасцю галасоў вылучаны наступныя таварышы.

У Вярхоўны Савет БССР — Аляксандр Уладзіміравіч Мілінкевіч, дацэнт кафедры агульнай і тэарэтычнай фізікі.

У абласны Савет народных дэпутатаў — Яўген Міхайлавіч Насань, студэнт 3-га курса юрыдычнага факультэта.

У гарадскі Савет народных дэпутатаў — Станіслаў Іосіфавіч Журомскі, дацэнт кафедры ўгалоўнага права, працэса і крыміналістыкі.

У раённы Савет народных дэпутатаў Ленінскага раёна г. Гродна — Таццяна Аляксееўна [illegible]зюкова, дацэнт кафедры ўсеагульнай гісторыі.

ЛЕНІНСКІ РАЁН АД ВЫБАРАЎ ДА ВЫБАРАЎ.

Амаль два гады назад адкрыта ў мікрараёне «Дзевятоўка» новая школа на 1296 месц — СШ № 28. Педкалектыў, які ўзначальвае малады дырэктар І. Г. Ахметаў, за гэты час здзейсніў многае. Добра абсталяваны вучэбныя кабінеты, добраўпарадкавана прышкольная тэрыторыя.

А галоўнае — у калектыве настаўнікаў заўжды пануе атмасфера творчасці, пошуку.

* * *

«Дзяржынец» — такая назва ў ваенна-патрыятычнага клуба, які створаны па рашэнню выканкома ў лютым мінулага года.

Зараз у клубе каля 200 падлеткаў. Сярод іх нямала так званых цяжкіх. Трэнеры праводзяць заняткі з моладдзю на базе фізкультурна-аздараўленчага комплексу «Юбілейны» і пакояў агульнафізічнай падрыхтоўкі Ленінскага РАУС і ЖЭС.

***

У 1989 годзе выканкомам аказана пэўная дапамога Гродзенскаму заапарку ў правядзенні яго рэканструкцыі і добраўпарадкавання. Зданы ў эксплуатацыю ўваходны павільён. Выкананы работы па знешняму асвятленню тэрыторыі заапарка. Пэўную дапамогу аказаў кааператыў «Рамонтнік», а таксама работнікі выканкома, камсамольцы швейнай фабрыкі і іншыя.

Але заапарк па-ранейшаму мае патрэбу ў дапамозе. Даўно адкрыты спецыяльны рахунак дапамогі заапарку. Але, на жаль, вельмі мала паступае туды сродкаў.

Выканком звяртаецца да Саветаў працоўных калектываў, навуковых устаноў, усіх жыхароў г. Гродна аказаць пасільную дапамогу адзінаму ў рэспубліцы заапарку.

Лік дапамогі заапарку — 601706 у абласной канторы Жылсацбанку г. Гродна.

Я. ЖАБРУН,
намеснік старшыні Ленінскага райвыканкома г. Гродна.

ДЫСКУСІЙНЫ КЛУБ: ПУНКТ ГЛЕДЖАННЯ

ЗА НАВУКОВУЮ І ГРАМАДСКУЮ КАШТОЎНАСЦЬ КАНЦЭПЦЫЙ, ЯКІЯ АБВЯШЧАЮЦЦА

Артыкул «Аднапартыйнасць, дэмакратызацыя, дэмакратыя» («Гродзенскі універсітэт», 6 снежня 1989 г.), які напісаны дацэнтам А. У. Мілінкевічам, прачытаў з вялікай цікавасцю. Яго з'яўленне сведчыць аб развіцці ў грамадстве, у тым ліку і ў нашым універсітэце, атмасферы ўсё больш мацнеючай галоснасці. І дарэмна Аляксандар Уладзіміравіч гаворыць у канцы артыкула аб магчымасці прычэплівання ярлыкоў ці пошуку «ворагаў народа», «адшчапенцаў» і інш. Няма цяпер забароненых для шырокага абмеркавання тэм, няма табу на нетрадыцыйныя падыходы да любых праблем тэорыі і практыкі сацыялізму, партыі і іншым, знікае былая «манаполія» на канчатковыя безапеляцыйныя адзнакі і вывады ў апошняй інстанцыі. Вартасць свабоднай думкі ўжо ў тым, што яна свабодная.

Разам з тым не магу пакінуць без увагі тое, што артыкул, які носіць публіцыстычны характар, уздымае каля дзесяці праблем. Ды фармулююцца яны некалькі з сарказмам: «што такое сацыялізм і дзе яго больш: у Ісландыі, Швецыі ці ў СССР, Уетнаме», «не партыя была ініцыятарам перабудовы, а яе палітычнае кіраўніцтва», рэакцыя ...ад «мы абралі афрыканскі шлях развіцця» да «рукі прэч ад нашых святынь» і г. д. І гэта, напэўна, не віна аўтара, а яго бяда. Мы, хто так доўга маўчаў, запамятавалі, што слова здольна быць не толькі лякарствам, але і ядам, які выклікае здранцвенне, апатыю, інтэлектуальны і маральны параліч. Пры гэтым нам, выкладчыкам, і асабліва студэнтам, трэба памятаць, што барацьба за ісціну не ў перманентным адмаўленні ўсяго і ўся — яна пераважна стваральная, што плюралізм — гэта школа, дзе кожны вучыцца. Гэта асабліва важна, падкрэсліваю, для нас, навукова-педагагічных супрацоўнікаў, вучоных універсітэта, якія выступаюць у ролі настаўнікаў. Ісціна не можа быць ні гучнай, ні ціхай; яна можа быть толькі адзіна правільнай.

Возьмем у гэтым аспекце паднятае ў артыкуле пытанне аб тым, дзе болей сацыялізму: ў Ісландыі, Швецыі ці ў СССР і Уетнаме? Размова ідзе, магчыма, аб западным вопыце сацыялізацыі, аб скандынаўскай ці сацыял-дэмакратычнай мадэлі гэтага вопыту. І есць падставы сцвярджаць, што ніякага сацыялізму там няма. Для гэтых краін характэрна ўстойлівае захаванне сектара буйнакапіталістычнага гаспадарання з высокім узроўнем эканамічнай эфектыўнасці. Высокаразвітая капіталістычная вытворчасць акружана там сектарамі грамадскай уласнасці і надбудавана сацыялізіраваным размеркаваннем. Але гэты элемент скандынаўскай мадэлі не толькі яе несумненная годнасць, але і захоўвае, вядзе да эксплуатацыі наёмнай працы, антаганізму, сацыяльна-класавай няроўнасці. У перыяд ажыццяўлення ленінскай палітыкі НЭПа ў нашай краіне рух да падобнай мадэлі даў, несумненна, больш жаданую, чым сталінская, мадэль дзяржаўнага сацыялізму.

У дыскусіі заўжды ёсць зыходная пазіцыя. Я зыходжу з таго, што сацыялізм сталінскага ці неасталінскага тыпу грунтоўна дыскрэдытаваны, вера ў яго перавагу страчана. Ні адна з мадэляў грамадства, якія існавалі ў нашай краіне пасля Кастрычніка («ваенны камунізм», «НЭП», сталінскі сацыялізм, яго застойная трансфармацыя), не можа быць прызнана паслядоўна сацыялістычнай. Але калі ісці ад больш прымітыўных прыкмет «абагульнення», якія і ўспрымаліся ў гэтыя перыяды як дастатковыя, то падставы газарыць аб нейкіх ранніх мадэлях рэальнага сацыялізму ёсць. Гэта дае падыход (для супрацоўнікаў вышэйшых навучальных устаноў, вучоных, студэнтаў) да тлумачэння парадаксальнай двойстасці эпохі, якая спалучала, напрыклад, сталінскі таталітарна-рэпрэсіўны рэжым з масавай сацыяльнай падтрымкай ладу.

Разам з тым, ідэі больш дасканалай і справядлівай, чым капіталістычная, грамадскай пабудовы існуюць, працягваюць валодаць розумамі мільёнаў. Сацыялізм як заканамерная фаза ў працэсе развіцця чалавечай цывілізацыі, павінен прыйсці на змену капіталізму. Справядлівае жаданне і нашага, і іншых народаў — ачысціць сацыялізм ад элементаў утапізму, аднавіць у правах агульнадэмакратычныя і гуманістычныя каштоўнасці, успрыняць усе лепшае, што дасягнута чалавечай цывілізацыяй, звярнуцца да канцэпцыі У. І. Леніна, выкладзенай у яго перадсмяротных працах. Гэта (у А. У. Мілінкевіча іншае) уяўленне аб сацыялізме як больш высокай ступені цывілізацыі захоўвае як асноўнае значэнне для разумення мэт і этапаў пераўтварэння сучасных, так і рознабаковага падыходу да разгляду праблем тэорыі, практыкі і палітыкі партыі.

Дацэнт А. У. Мілінкевіч (ён камуніст, член парткома) гаворыць аб партыі ў розных аспектах. Але і тут неабходна прынцыповая пазіцыя. Хачу яе выразіць ленінскай ідэяй. У. І. Ленін бачыў асноўнае прызначэнне партыі, якая прыйшла да ўлады ў выніку рэвалюцыі, у тым, што яна павінна «вести весь народ к социализму, направлять, организовывать новый строй, быть учителем, руководителем, вождем всех трудящихся» (Полн. собр. соч. — Т. 33 — С. 26) Навукова выражаючы інтарэсы працоўных, у першую чаргу, рабочага класа, аб'ядноўваючы ў сваіх радах самыя прагрэсіўныя сілы грамадства, Камуністычная партыя павінна стаць палітычным авангардам савецкага народа. Гэта яе авангардная роля, а не кіруючая, можа вызначацца канстытуцыйна, або зусім не фіксіравацца ў Асноўным законе. У трох першых Савецкіх Канстытуцыях спецыяльнага артыкула аб партыі не было.

Недзе з сярэдзіны 20-х гадоў пад уплывам працэсаў, якія адбываліся ў той час у партыі і ў грамадстве, змянілася яе прырода, сутнасць. Былі адхілены многія важныя ідэі і падыходы да партыі, змешчаныя і ў «Маніфесце», і ў практыцы Саюза камуністаў, ва ўласна бальшавіцкіх дакументах і практыцы, такія, як ідэя роўнасці членаў партыі, выбарнасці, справаздачнасці, змяняльнасці. Ёй была навязана цвёрдая мадэль з яркімі ярлыкамі — дэкларыраванымі нормамі, прынцыпамі, заканамернасцямі. Усё гэта прызнала сама партыя. Яна і пачала працэс самаабнаўлення, перабудовы работы ўсіх сваіх звенняў.

І ў гэтым кантэксце зусім незразумелыя доказы Аляксандра Уладзіміравіча «...не партыя была ініцыятарам перабудовы,а яе палітычнае кіраўніцтва».

Шкада, што аўтар зусім не знаёмы з матэрыяламі студзеньскага (1987 г.) Пленума ЦК КПСС, кнігай М. С. Гарбачова «Перабудова для нашай краіны і ўсяго свету». А канцэпцыя перабудовы створана змычкай ініцыятывы кіраўніцтва КПСС і шырокага масавага руху знізу, створана як выражэнне карэнных перспектыўных інтарэсаў усіх працоўных, іх узнікшых патрабаванняў, іх гарачых імкненняў. Таму яна і атрымала поўную і рашучую падтрымку ў народзе і выклікала вялізную цікавасць і рэзананс за мяжой. Ці магчыма пасля гэтага супрацьпастаўляць кіраўніцтва ўсёй партыі?

Мэты і ход перабудовы паставілі задачу адрадзіць ленінскую канцэпцыю партыі як палітычнага авангарда ўсіх працоўных. У чым бачыцца аб'ектыўная заканамернаць і патрэбнасць падыходу? У тым, што толькі такая партыя здольна выступіць у якасці сілы, якая кансалідуе грамадства, гарманізуе інтарэсы і матывы дзейнасці розных класаў і сацыяльных груп насельніцтва, інтэгрыруе тэарэтычны пошук, інтэлектуальную энергію і калектыўны вопыт у адзіны паток сацыялістычнага аднаўлення на шляхах рэвалюцыйнай перабудовы. Гэта адзін з доказаў неабходнасці на пэўны перыяд адной партыі.

У публікацыі аўтар абсалютызіруе вопыт многапартыйнасці ў буржуазных, у тым ліку, у ЗША, странах, дамагаецца такой сістэмы ў нас. Што гаворыць навука і практыка наконт гэтага, а не апаненты многапартыйнасці, а імі з'яўляюцца і нашы ідэйныя ворагі (яны ёсць і будуць, бо ленінізм і сацыялізм невынішчальны), аб якіх піша аўтар артыкула.

Па-першае, многапартыйнасць з'яўляецца прадуктам канкрэтна-гістарычных умоў, асаблівасцей і традыцый той ці іншай краіны. І неабходна адрозніваць буржуазную і сацыялістычную многапартыйнасць. У нашай краіне з 12 снежня 1917 г. па 15 сакавіка 1918 г. СНК быў многапартыйным. Затым працоўныя зверглі эсэраў, меньшавікоў за палітычную несастаяльнасць іх дамаганняў.

Па-другое, калі бачыць у шматпартыйнасці «супрацьвагу» партыі, засцерагаючай ад прымання няправільных рашэнняў, то ў нашай краіне гэтую ролю могуць адыгрываць розныя аб'яднанні і арганізацыі, якія ўваходзяць у сістэму самакіравання, у тым ліку і нефармальныя.

Нарэшце, новыя гарантыі выпрацоўкі правільных палітычных рашэнняў КПСС імкнецца знайсці і знаходзіць на шляху поўнага выкарчоўвання са свайго ўнутрыпартыйнага жыцця ўсіх форм бюракратызму, канцэляршчыны, фармалізму, на шляху ўмацавання ўнутрыпартыйнай дэмакратыі, вылучэння пры распрацоўцы палітыкі партыі альтэрнатыўных варыянтаў, стварэння неабходных механізмаў для прадухілення з'яўлення якіх бы то ні было культаў, культыкаў, для праяўлення поўнай свабоды дыскусіі, платформ.

Гістарычны вопыт сведчыць, што многапартыйнасць наогул не ёсць гарантыя дэмакратычнага палітычнага рэжыму. У нашых сённяшніх умовах заклікі да стварэння апазіцыйных палітычных партый, думаецца, есць не што іншае, як спроба ўзбуджэння палітычнай і сацыяльнай напружанасці ў грамадстве. Ненатуральнае стварэнне, як гэта здарылася ў Літве, альтэрнатыўных палітычных партый (пад якую б назву — камуністычная, сацыялістычная і г. д. — яны не хаваліся) абарочваецца стратай палітычнай стабільнасці. Ці можам мы думаць аб захоўванні грамадзянскага міру ў краіне? Наогул, заклікі да разбурэння ёсць не што іншае, як палітычная безразважнасць. І ў пытанні аб многапартыйнасці трэба зыходзіць з існуючых рэалій, не абсалютызаваць гэтую сістэму, а бачыць і найбольш эфектыўныя сродкі, і формы ажыццяўлення сацыялістычнага плюралізму, якія адказваюць канкрэтным асаблівасцям краіны.

Нікольні не прэтэндую на ісціну апошняй інстанцыі па выказаным праблемам, хачу ў заканчэнне нагадаць вядомыя словы К. Маркса аб тым, што ідэі з'яўляюцца матэрыяльнай сілай, калі яны авалодваюць масамі. І мы не можам быць абыякавымі да ідэй, якія атрымаюць масавае распаўсюджванне ў наш час. А, памятаючы, што ў перыяды крутых перамен сустракаецца няўстойлівасць, а то і экстрэмізм, падкідваюцца знешне радыкальныя, але па сваёй сутнасці, неабгрунтаваныя рашэнні. У гэтых абставінах важна пэўным чынам вызначаць навуковую і грамадскую каштоўнасць канцэпцый, якія абвяшчаюцца.

М. ЖАРСКІ,
прафесар, загадчык кафедры гісторыі КПСС, член парткома.

ПРАЕКТ

ПРАВІЛЫ ЎНУТРАНАГА РАСПАРАДКУ ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя ЯНКІ КУПАЛЫ

I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ.

1. Згодна з Канстытуцыяй СССР і Канстытуцыяй БССР грамадзяне СССР маюць права на працу. Абавязак і справа гонару кожнага здольнага да працы грамадзяніна СССР — добрасумленная праца ў выбранай ім вобласці грамадскакарыснай дзейнасці, прытрымлівацца працоўнай дысцыпліны.

Дысцыпліна працы — гэта не толькі строгае прытрымліванне правілаў унутранага працоўнага распарадку, але і сумленныя, творчыя адносіны да сваёй працы і вучобы, забеспячэнне яе высокай якасці, вытворчае выкарыстанне працоўнага часу.

Працоўная і вучэбная дысцыпліна забяспечваецца стварэннем неабходных арганізацыйных і эканамічных умоў для нармальнай высокапрадукцыйнай працы, сумленнымі адносінамі да працы, метадамі перакanання, выхоўвання, а таксама падтрымка за добрасумленную працу. Да парушальнікаў працоўнай дысцыпліны прымяняюцца меры дысцыплінарнага і грамадскага ўздзеяння.

Важнейшым напрамкам у рабоце па выхаванню і ўмацаванню сацыялістычнай дысцыпліны працы з'яўляецца эфектыўнае выкарыстанне правоў, дадзеных працоўным калектывам Законам СССР «Аб працоўных калектывах і павышэнні іх ролі ў кіраванні прадпрыемствамі, установамі, арганізацыямі».

2. Правілы ўнутранага распарадку ўніверсітэта маюць на мэце садзейнічаць выхаванню членаў калектыва ў духу камуністычнай ідэйнасці і адданасці Савецкай Радзіме сумленных адносін да працы і навучання, далейшага ўмацавання сацыялістычнай працоўнай і вучэбнай дысцыпліны, арганізацыі працы і навучання на навуковай аснове, рацыянальнага выкарыстання працоўнага і вучэбнага часу, высокай якасці працы, павышэння прадукцыйнасці працы, эфектыўнасці грамадскай вытворчасці і паляпшэння якасці вучэбнага працэсу, поўнай рэалізацыі галоўных задач вышэйшых навучальных устаноў, якія выцякаюць з Асноў заканадаўства Саюза ССР і саюзных рэспублік аб народнай асвеце.

3. Пытанні, звязаныя з прымяненнем правілаў унутранага распарадку, вырашаюцца адміністрацыяй універсітэта ў межах прадстаўленых ёй правоў, а ў выпадках, прадугледжаных дзейнічаючым заканадаўствам і правіламі ўнутранага распарадку, — сумесна або ўзгоднена з прафсаюзным камітэтам. Гэтыя пытанні вырашаюцца таксама працоўным калектывам згодна з яго паўнамоцтвамі.

II. ПАРАДАК ПРЫЁМУ І ЗВАЛЬНЕННЯ РАБОТНІКАЎ.

4. Працоўныя і служачыя рэалізуюць права на працу шляхам заключэння працоўнага дагавора аб працы на прадпрыемстве, ва установе, арганізацыі.

5. Пры прыёме на работу адміністрацыя вышэйшай навучальнай установы абавязана патрабаваць ад паступаючага:

а) прадстаўлення працоўнай кніжкі, афармленай ва ўстаноўленым парадку, а калі асоба паступае на работу ўпершыню — даведкі аб апошнім занятку, выдадзенай па месцу жыхарства адпаведнай жыллёва-эксплуатацыйнай арганізацыяй, сельскім ці пасялковым Саветам народных дэпутатаў, вулічным камітэтам (даведка, выдадзеная вулічным камітэтам, павінна быць засведчана выканаўчым камітэтам адпаведнага Савета народных дэпутатаў), а звольненыя з радоў Узброеных Сіл СССР абавязаны прадставіць адміністрацыі ваенны білет;

б) прадстаўленне пашпарту згодна з заканадаўствам аб пашпартах.

Прыём на работу ва універсітэт без прадстаўлення ўказаных дакументаў не дапускаецца.

Пры прыёме на работу, патрабуючую спецыяльных ведаў, адміністрацыя вышэйшай навучальнай установы мае права патрабаваць ад работніка прадстаўлення дыплома ці іншага дакумента аб атрыманай адукацыі ці прафесіянальнай падрыхтоўцы.

Забараняецца патрабаваць ад працоўных пры прыёме на работу дакументаў, прадстаўленне якіх не прадугледжана заканадаўствам. Прыём на работу афармляецца загадам адміністрацыі універсітэта, які даводзіцца да ведама работніка пад распіску. У загадзе павінна быць указана назва работы (пасады) згодна з адзіным тарыфна-кваліфікацыйным даведнікам работ і прафесій рабочых ці штатным раскладам і ўмовамі аплаты працы.

Фактычнае дапушчэнне да работы адпавядаючай службовай асобе лічыцца заключэннем працоўнага дагавора незалежна ад таго, ці быў прыём на работу афармлены належным чынам.

6. Пасады прафесарска-выкладчыцкага саставу і навуковых работнікаў замяшчаюцца па конкурсу ва ўстаноўленым парадку.

Дэканы факультэтаў выбіраюцца саветам факультэта тайным галасаваннем тэрмінам на 5 гадоў з ліку прафесараў ці найбольш вопытных дацэнтаў і зацвярджаюцца на пасадзе рэктарам універсітэта.

Загадчыкі кафедр выбіраюцца Вучоным саветам універсітэта (факультэта) тэрмінам на 5 гадоў, кіруюць дзейнасцю кафедры і нясуць поўную адказнасць за вынікі яе работы.

7. Работнікі ўніверсітэта ў асобных выпадках могуць працаваць па сумяшчальніцтву ва ўстаноўленым парадку.

8. Пры паступленні на работу ці пераводзе супрацоўніка вышэйшай навучальнай установы ва ўстаноўленым парадку на іншую работу адміністрацыя абавязана:

а) азнаёміць працаўніка з даручанай работай, умовамі і аплатай працы і растлумачыць яго правы і абавязкі;

б) азнаёміць яго з правіламі ўнутранага распарадку і вучэбным рэжымам у дадзенай навучальнай установе;

в) праінструктаваць па тэхніцы бяспекі, вытворчай санітарыі, гігіене працы, супрацьпажарнай ахове і іншых правілах па ахове працы, а пры прыёме на работу з небяспечнымі ўмовамі працы правесці навучанне і атэстацыю па веданню правілаў аховы працы.

9. На ўсіх работнікаў універсітэта, якія працуюць звыш пяці дзён, заводзяцца працоўныя кніжкі ў парадку, устаноўленым дзейнічаючым заканадаўствам. Асобам, якія працуюць у вышэйшай навучальнай установе на ўмовах пагадзіннай аплаты, працоўная кніжка выдаецца пры ўмове, калі дадзеная работа з'яўляецца асноўнай.

Усім рабочым, а таксама тым служачым, праца якіх аплачваецца здзельна, адміністрацыя абавязана выдаваць пасля сканчэння 5 дзён пасля прыёму на работу разліковыя кніжкі або выдаваць пры выплаце заработнай платы разліковыя лісткі.

10. Спыненне працоўнага дагавору можа мець месца толькі на асновах, прадугледжаных заканадаўствам. Работнікі універсітэта, у тым ліку прафесарска-выкладчыцкі састаў і навуковыя супрацоўнікі, маюць права скасаваць працоўны дагавор, заключаны на неакрэслены тэрмін, папярэдзіўшы пра гэта адміністрацыю пісьмова за два месяцы. Пры скасаванні дагавора па ўважлівых прычынах, прадугледжаных дзейнічаючым заканадаўствам, працаўнікі папярэджваюць пра гэта адміністрацыю за адзін месяц.

Час выканання работ, на які работнік пераведзены за парушэнне працоўнай дысцыпліны (падпункт «г» пункту 44), у тэрмін папярэджвання аб звальненні не залічваецца.

Пасля сканчэння ўказаных тэрмінаў папярэджання працаўнік мае права спыніць работу, а адміністрацыя вышэйшай навучальнай установы абавязана выдаць яму працоўную кніжку і правесці з ім разлік.

Па дагаворанасці паміж работнікам і адміністрацыяй працоўны дагавор можа быць скасаваны і да заканчэння тэрміну папярэджання аб звальненні.

Тэрміновы працоўны дагавор належыць скасаванню датэрміновa па патрабаванню работніка ў выпадку яго хваробы ці інваліднасці, перашкаджаючых выкананню работы па дагавору, парушэння адміністрацыяй заканадаўства аб працы, працоўнага дагавора і па іншых прычынах.

Скасаванне працоўнага дагавора па ініцыятыве адміністрацыі вышэйшай навучальнай установы не дапускаецца без папярэдняй згоды прафсаюзнага камітэта выкладчыкаў і супрацоўнікаў, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных заканадаўствам Саюза ССР.

11. Звальненне штатных работнікаў з ліку прафесарска-выкладчыцкага саставу ў сувязі са скарачэннем аб'ёму працы можа праводзіцца толькі пасля заканчэння вучэбнага года з захаваннем дзейнічаючага заканадаўства.

12. Спыненне працоўнага дагавора афармляецца загадам адміністрацыі універсітэта.

13. У дзень звальнення адміністрацыя абавязана выдаць рабочаму ці служачаму яго працоўную кніжку з занесеным у яе запісам аб звальненні і правесці з ім канчатковы разлік. Запісы аб прычынах звальнення ў працоўную кніжку павінны рабіцца згодна з фармуліроўкамі дзейнічаючага заканадаўства і са спасылкай на адпаведны артыкул пункта Закона. Днём звальнення лічыцца апошні дзень работы.

III. АСНОЎНЫЯ АБАВЯЗКІ РАБОТНІКАЎ І СТУДЭНТАЎ.

14. Усе работнікі універсітэта абавязаны:

а) працаваць добрасумленна, падтрымліваць дысцыпліну працы — аснову парадку ў вышэйшай навучальнай установе, своечасова і дакладна выконваць распараджэнні адміністрацыі, выкарыстоўваць увесь працоўны час для прадукцыйнасці працы, пазбягаць дзеянняў, якія перашкаджаюць іншым работнікам выконваць іх працоўныя абавязкі;

б) прытрымлівацца патрабаванняў па ахове працы, тэхніцы бяспекі, вытворчай санітарыі, гігіене працы і супрацьпажарнай ахове, прадугледжаныя адпаведнымі правіламі і інструкцыямі, працаваць у выдадзеным спецпрапратцы, спецабутку, карыстацца неабходнымі сродкамі індывідуальнай аховы;

в) прымаць меры да неадкладнай ліквідацыі прычын і ўмоў, якія не дазваляюць ці робяць цяжкай нармальную працу (прастой, аварыя), і неадкладна апавяшчаць аб здарэнні адміністрацыю;

г) захоўваць устаноўлены парадак захавання матэрыяльных каштоўнасцей і дакументаў;

д) беражліва і ўмацоўваць сацыялістычную маёмасць, эфектыўна выкарыстоўваць абсталяванне, беражліва адносіцца да інструментаў, якія выдаюцца для карыстання работнікам, эканомна і рацыянальна расходаваць сыравіну, матэрыялы, энергію, топліва і іншыя матэрыяльныя рэсурсы;

е) весці сябе належным чынам, прытрымлівацца правіл сацыялістычнага супольнага жыцця;

ж) сістэматычна павышаць сваю дзелавую (вытворчую) кваліфікацыю;

з) захоўваць правілы ўнутранага распарадку;

15. Прафесарска-выкладчыцкі і навуковы састаў універсітэта абавязаны:

а) забяспечваць высокую эфектыўнасць педагагічнага працэсу, выхоўваць у студэнтаў камуністычную мараль, развіваць у іх самастойнасць, ініцыятыву, творчыя здольнасці;

б) паважаць асабістую годнасць будучых спецыялістаў, праяўляць клопат аб іх культурным і фізічным развіцці;

в) весці навуковыя даследаванні, якія забяспечаць высокі навуковы ўзровень зместу навучання, актыўна выхоўваць у іх студэнтаў;

г) пастаянна павышаць свой прафесійны ідэйна-палітычны і агульнакультурны ўзровень, рэгулярна, не меней аднаго разу за 5 гадоў, праводзіць розныя формы павышэння кваліфікацыі.

17. Рабочыя вучэбна-вытворчых майстэрняў, цэхаў, гаспадарак і іншых арганізацый павінны:

а) павышаць прадукцыйнасць працы, своечасова і дакладна выконваць работы па нарадах і заданнях, нормы выпрацоўкі і нарміраваныя вытворчыя заданні, дабівацца перавыканання гэтых норм;

б) паляпшаць якасць працы і выпускаемай прадукцыі, не дапускаць упушчэння і браку ў працы, захоўваць тэхналагічную дысцыпліну;

в) прымаць меры да неадкладнай ліквідацыі прычын і ўмоў, якія перашкаджаюць або робяць цяжэйшым нармальную вытворчасць працы (прастой, аварыя), і неадкладна давесці да ведама адміністрацыі.

18. Кола абавязкаў (работ), якія выконвае кожны рабочы па сваёй спецыяльнаці, кваліфікацыі ці службе, вызначаецца адзіным тарыфна-кваліфікацыйным даведнікам прац і прафесій рабочых, кваліфікацыйным даведнікам пасад служачых, а таксама тэхнічнымі правіламі, службовымі інструкцыямі і палажэннямі ва ўстаноўленым парадку.

19. Студэнты універсітэта абавязаны:

а) глыбока авалодваць тэарэтычнымі ведамі, практычнымі навыкамі і сучаснымі метадамі даследаванняў па выбранай спецыяльнасці, грамадскімі навукамі;

б) выконваць ва ўстаноўленыя тэрміны ўсе віды заданняў, прадугледжаных адпаведнымі вучэбнымі планамі і праграмамі навучання;

в) пастаянна імкнуцца да павышэння агульнай культуры, маральнага і фізічнага ўдасканальвання;

г) захоўваць правілы ўнутранага распарадку.

Студэнты ўдзельнічаюць у прапагандзе навуковых і палітычных ведаў, а таксама ў грамадскіх мерапрыемствах, якія праводзяцца вышэйшай навучальнай установай сярод насельніцтва.

20. Пры адсутнасці на семінарскіх і практычных занятках па ўважлівых прычынах студэнт абавязаны не пазней, чым на наступны дзень паставіць да ведама дэкана факультэта і ў першы дзень прадставіць даныя аб прычынах пропуску заняткаў. У выпадку хваробы студэнт прадстаўляе дэкану факультэта даведку ўстаноўленага ўзору адпаведнай лячэбнай установы.

21. Пры ўваходзе кіраўнікоў універсітэта і факультэта ў аўдыторыю студэнты абавязаны ўставаць.

22. Студэнты абавязаны беражліва і акуратна адносіцца ад сацыялістычнай маёмасці (інвентар, вучэбныя дапаможнікі, кнігі, прыборы і г. д.). Студэнтам забараняецца без дазволу адміністрацыі вышэйшай навуковай установы выносіць прадметы і рознае абсталяванне з лабараторый, вучэбных і іншых памяшканняў.

Студэнты павінны быць дысцыплінаванымі, акуратнымі як у навучальнай установе, так і на вуліцы, у грамадскіх месцах.

24. Належную чыстату і парадак ва ўсіх вучэбных і вучэбна-вытворчых памяшканнях забяспечваюць тэхнічны персанал і студэнты на пачатках самаабслугоўвання і згодна з устаноўленым ва універсітэце распарадкам.

IV. АСНОЎНЫЯ АБАВЯЗКІ АДМІНІСТРАЦЫІ.

25. Адміністрацыя універсітэта абавязана:

а) правільна арганізаваць працу прафесарска-выкладчыцкага саставу і іншых супрацоўнікаў навучальнай установы, каб кожны працаваў па сваёй спецыяльнасці і кваліфікацыі, меў замацаванае за ім рабочае месца, своечасова, да пачатку даручанай працы быў азнаёмлены з устаноўленным заданнем і забяспечаны работай на працягу ўсяго працоўнага дня (змены); забяспечыць здаровыя небяспечныя ўмовы працы, справаны стан абсталявання.

Своечасова паведамляць выкладчыкам расклад іх вучэбных заняткаў і зацвярджаць на наступны навучальны год індывідуальныя планы вучэбна-метадычнай, навукова-даследчай і іншых відаў работ, якія выконвае прафесарска-выкладчыцкі састаў вышэйшых навучальных устаноў;

б) ствараць умовы для павышэння якасці падрыхтоўкі і выхавання спецыялістаў з улікам патрабаванняў сучаснай вытворчасці, навейшых дасягненняў навукі, тэхнікі і культуры, перспектыў іх развіцця і навуковай арганізацыі працы; арганізаваць вывучэнне і ўкараненне перадавых метадаў навучання, механізаваць цяжкія і працаёмкія работы ў вучэбна-вытворчых майстэрнях (гаспадарках) вучэбнай установы;

в) здзяйсняць выхаваўчую работу з супрацоўнікамі, студэнтамі, аспірантамі, слухачамі падрыхтоўчага аддзялення, ствараць умовы для правядзення культурна-выхаваўчай работы, заняткаў фізічнай культурай і мастацкай творчасцю;

г) своечасова разглядаць і ўкараняць прапановы грамадскіх арганізацый, выкладчыкаў і іншых работнікаў, накіраваныя на паляпшэнне работы вучэбнай установы, падтрымліваць і ўзнагароджваць лепшых работнікаў вучэбнай установы;

д) забяспечваць строгае захоўванне працоўнай і вытворчай дысцыпліны, пастаянна здзяйсняючы арганізатарскую, эканамічную і палітыка-выхаваўчую работу, накіраваную на яе ўмацаванне, прадухіленне страт працоўнага часу, рацыянальнае выкарыстанне працоўных рэсурсаў, фарміраванне стабільных працоўных калектываў; прымяняць меры ўздзеяння да парушальнікаў працоўнай дысцыпліны, улічваючы пры гэтым думкі працоўных калектываў;

е) няўхільна захоўваць заканадаўства аб працы і правілах аховы працы; паляпшаць умовы працы і вучобы супрацоўнікаў, студэнтаў, аспірантаў і слухачоў падрыхтоўчага аддзялення. Забяспечваць належнае тэхнічнае абсталяванне ўсіх рабочых месц і ствараць на іх умовы працы, адпаведныя правілам аховы працы (правілам па тэхніцы бяспекі, санітарным нормам і правілам і інш.). Пры адсутнасці ў правілах патрабаванняў, выкананне якіх пры выдзенні работ неабходна для забеспячэння небяспечных умоў працы адміністрацыя універсітэта па ўзгодненню з прафсаюзным камітэтам выкладчыкаў і супрацоўнікаў прымае меры, якія гарантуюць бяспечныя ўмовы працы;

ж) прымаць неабходныя меры па прафілактыцы вытворчага траўматызму, прафесіянальных і іншых захворванняў рабочых і служачых у выпадках, прадугледжаных заканадаўствам, своечасова прадстаўляць льготы і кампенсацыі ў сувязі са шкоднымі ўмовамі працы (скарочаны працоўны дзень, дадатковыя водпускі, лячэбна-прафілактычнае харчаванне і інш.) забяспечыць згодна з нормамі, якія дзейнічаюць, палажэннямі

ПРАЕКТ

ПРАВІЛЫ ЎНУТРАНАГА РАСПАРАДКУ ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя ЯНКІ КУПАЛЫ

спецыяльнай вопраткай, абуткам і іншымі сродкамі індывідуальнай аховы, арганізоўваць належны дагляд за гэтымі сродкамі;

з) пастаянна кантраляваць веданне і выкананне супрацоўнікамі, студэнтамі, аспірантамі, слухачамі падрыхтоўчага аддзялення ўсіх патрабаванняў і інструкцый па тэхніцы бяспекі, вытворчай санітарыі і гігіене працы, супрацьпажарнай ахове;

і) забяспечваць спраўнае ўтрыманне памяшкання, асвятлення, вентыляцыі, абсталявання, ствараць нармальныя ўмовы для захавання верхняга адзення супрацоўнікаў навучальнай установы, аспірантаў, студэнтаў і слухачоў падрыхтоўчага аддзялення;

к) забяспечваць празільнае прымяненне дзейнічаючых умоў аплаты і нарміравання працы; выдаваць заработную плату і стыпендыю ва ўстаноўленыя тэрміны;

л) забяспечваць своечасовае прадстаўленне водпускаў усім работнікам навучальнай установы. Паведамляць выкладчыкам у канцы навучальнага года (да адыходу ў водпуск) іх гадавую нагрузку ў новым навучальным годзе;

м) развіваць сацыялістычнае спаборніцтва, ствараць умовы працоўнаму калектыву для ўсямернага павышэння эфектыўнасці ідэйна-выхаваўчай, вучэбна-метадычнай і навукова-даследчай работы, прадукцыйнасці працы, эфектыўнасці грамадскай вытворчасці, паляпшэння якасці работ, зніжэння сабекошту выпускаемай прадукцыі, рацыянальнага выкарыстання працоўнага часу, сыравіны, матэрыялаў, энергіі, іншых рэсурсаў, выканання планаў паставак па дагаворах і заказах, паспяховага выканання сацыялістычных абавязацельстваў, своечасовага падвядзення вынікаў і вызначэнне перакацаў спаборніцтва, павышэння маральнага і матэрыяльнага стымулявання высокапрадукцыйнай працы, рашэння пытанняў аб узнагароджванні перадавых калектываў і работнікаў; забяспечваць распаўсюджванне і ўкараненне перадавога вопыту і каштоўных ініцыятыў — работнікаў данага і іншых працоўных калектываў;

н) своечасова разглядаць і ўжываць вынаходніцтвы і рацыяналізатарскія прапановы, падтрымліваць наватараў вытворчасці, садзейнічаць масавай навукова-тэхнічнай творчасці;

о) забяспечваць сістэматычнае павышэнне дзелавой (вытворчай) кваліфікацыі работнікаў і ўзроўню іх эканамічных і прававых ведаў, ствараць неабходныя ўмовы для сумяшчэння працы з навучаннем на вытворчасці і ў навучальных установах;

п) ствараць працоўнаму калектыву неабходныя ўмовы для выканання ім сваіх паўнамоцтваў, прадугледжаных Законам СССР «Аб працоўных калектывах і павышэнні іх ролі ў кіраванні прадпрыемствамі, установамі, арганізацыямі»; садзейнічаць стварэнню ў працоўным калектыве дзелавых, творчых абставін, усямерна падтрымліваць і развіваць ініцыятыву і актыўнасць працоўных, забяспечваць іх удзел у кіраванні універсітэтам, у поўнай меры выкарыстоўваючы сход працоўнага калектыву, вытворчыя нарады, канферэнцыі і розныя формы грамадскай дзейнасці;

своечасова разглядаць крытычныя заўвагі работнікаў і паведамляць аб прынятых мерах;

р) уважліва адносіцца да патрабаванняў работнікаў, забяспечваць паляпшэнне іх жыллёвых і культурна-бытавых умоў, ажыццяўляць будаўніцтва, рамонт і ўтрыманне ў належным стане жылых дамоў, інтэрнатаў, клубных устаноў, аздараўленчых, спартыўных збудаванняў, дзіцячых дашкольных устаноў, а таксама прадпрыемстваў гандлёва-бытавога абслугоўвання і сталовых непасрэдна ў навучальнай установе, аказваць дапамогу ў кааператыўным і індывідуальным будаўніцтве; арганізаваць улік работнікаў, якім неабходна палепшыць жыллёвыя ўмовы, размяркоўваць жыллёвую плошчу згодна з дзейнічаючым заканадаўствам па сумеснаму рашэнню з прафсаюзным камітэтам выкладчыкаў і супрацоўнікаў і забяспечыць шырокую галоснасць пры рашэнні гэтых пытанняў.

Забяспечваць неабходным абсталяваннем, матэрыяламі, інвентаром, інструментамі вучэбны працэс, навуковую, культурна-выхаваўчую, аздараўленчую і фізкультурна-масавую работу;

с) распрацоўваць і праводзіць мерапрыемствы па папярэджванню і прадухіленню праяўленняў п'янства і алкагалізму, здзяйсняць выхаваўчыя меры, накіраваныя на рашучае ўмацаванне антыалкагольнай барацьбы і павышэнне яе эфектыўнасці. Актывізаваць дзейнасць працоўных калектываў па ліквідацыі прычын і ўмоў, якія нараджаюць п'янства і алкагалізм.

Адміністрацыя выконвае свае абавязкі ў адпаведных выпадках сумесна ці па ўзгадненню з прафсаюзным камітэтам універсітэта, а таксама з улікам паўнамоцтваў працоўнага калектыву.

V. ПРАЦОЎНЫ ЧАС І ЯГО ВЫКАРЫСТАННЕ.

27. Ва універсітэце функцыянуе 6-дзённы працоўны тыдзень.

28. Для прафесарска-выкладчыцкага саставу ўстаноўлены шасцігадзінны працоўны дзень.

У межах шасцігадзіннага працоўнага дня выкладчыкі павінны весці ўсе віды вучэбна-метадычнай, выхаваўчай і іншых работ, якія прадугледжаны займаемай пасадай, вучэбным планам і планам навукова-даследчай працы.

Работа па сумяшчальніцтву, дазволеная дзейнічаючым заканадаўствам прафесарска-выкладчыцкаму саставу, рабочым і служачым павінна выконвацца ў непрацоўны па асноўнай службе час.

29. Кантроль за выкананнем раскладу вучэбных заняткаў і за выкананнем індывідуальных планаў вучэбна-метадычнай і навукова-даследчай работы ажыццяўляецца загадчыкамі кафедр і дэканамі факультэтаў.

30. Працягласць працоўнага дня навуковага, вучэбна-дапаможнага і адміністрацыйна-гаспадарчага персаналу — 7 гадзін.

Для асоб, занятых на работах са шкоднымі ўмовамі, устанаўліваецца скарочаны працоўны дзень згодна з дзейнічаючым заканадаўствам.

31. Час пачатку і заканчэння працы і перапынку для адпачынку і харчавання ўстанаўліваецца для працоўных і служачых з 9 да 17 гадзін, у перадвыхадныя і перадсвяточныя дні з 9 да 16 гадзін.

Па ўзгадненню з прафсаюзнымі камітэтамі выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў падраздзяленням універсітэта і асобным групам працаўнікоў можа ўстанаўлівацца іншы час пачатку і канца працы. Калектывы бібліятэкі, аддзела кадраў, навуковага, вучэбнага і гаспадарчай частак і некаторых іншых падраздзяленняў на падставе загада Міністэрства вышэйшых навучальных устаноў СССР № 63 ад 30 жніўня 1985 года працуюць на рэжыме гібкага працоўнага часу.

32. Аб пачатку і канцы работы, а таксама аб перапынку рабочыя і служачыя абвяшчаюцца адпаведнымі сігналамі ці іншым спосабам. Формы кантролю за працай выкладчыкаў устанаўліваюцца адміністрацыяй па ўзгадненню з прафсаюзнай арганізацыяй універсітэта.

Да пачатку працы кожны работнік абавязаны адзначыць свой прыход на работу, а пасля заканчэння працоўнага дня — адыход з работы ў парадку, устаноўленым ва універсітэце.

33. Адміністрацыя абавязана арганізаваць улік прыходу на працу і адыходу з працы.

Работніка, які з'явіўся на работу ў нецвярозым стане, адміністрацыя не дапускае да працы ў дадзены працоўны дзень (змену).

34. Пры няяўцы на працу выкладчыка ці іншага супрацоўніка універсітэта адміністрацыя абавязана неадкладна прыняць меры да замены яго іншым выкладчыкам (работнікам).

35. Звышурочныя работы, як правіла, не дапускаюцца. Прымяненне звышурочных работ адміністрацыяй можа праводзіцца ў выключных выпадках, прадугледжаных дзейнічаючым заканадаўствам, толькі з дазволу прафсаюзнага камітэту універсітэта.

36. ЗАБАРАНЯЕЦЦА Ў ПРАЦОЎНЫ ЧАС:

а) адцягваць працоўных і служачых ад іх непасрэднай працы, адрываць іх з работы для выканання грамадскіх абавязкаў і правядзення рознага роду мерапрыемстваў, не звязаных з вытворчай дзейнасцю (злёты, семінары, спартыўныя спаборніцтвы, удзел у мастацкай самадзейнасці, турысцкія паездкі і г. д.);

б) склікаць сходы, пасяджэнні і розныя нарады па грамадскіх справах.

37. Чарговасць прадстаўлення штогадовых водпускаў устанаўліваецца адміністрацыяй універсітэта па ўзгадненню з прафсаюзным камітэтам выкладчыкаў і супрацоўнікаў з улікам неабходнасці забеспячэння нармальнага ходу працы вучэбнай установы і спрыяльных умоў для адпачынку працоўных і служачых. Графік водпускаў складаецца на кожны каляндарны год не пазней 5 снежня бягучага года і даводзіцца да ведама ўсіх працоўных і служачых.

Прафесарска-выкладчыцкаму саставу прадстаўляюцца, як правіла, штогадовыя водпускі ў летні канікулярны перыяд.

VI. УЗНАГАРОДЫ ЗА ПОСПЕХІ Ў ПРАЦЫ І ВУЧОБЕ.

38. За ўзорнае выкананне працоўных абавязкаў, поспехі ў сацыялістычным спаборніцтве, павышэнне прадукцыйнасці працы, паляпшэнне якасці прадукцыі, працяглую бездакорную працу, наватарства ў працы і за іншыя дасягненні ў працы выкладчыкі і работнікі могуць узнагароджвацца:

а) аб'явай падзякі;

б) выдачай прэміі;

в) каштоўным падарункам;

г) Ганаровай граматай;

д) занясеннем у Кнігу гонару, на Дошку гонару.

Узнагароды, прадугледжаныя пунктамі «а», «б», «в», прымяняюцца адміністрацыяй па ўзгадненню, а прадугледжаныя пунктамі «г» і «д» — сумесна з прафсаюзным камітэтам выкладчыкаў і супрацоўнікаў вышэйшай навучальнай установы.

Пры ўзнагароджванні ўлічваецца думка працоўнага калектыву.

Узнагароды аб'яўляюцца ў загадзе рэктара (прарэктара), даводзяцца да ведама ўсяго калектыву і заносяцца ў працоўную кніжку работніка.

39. Работнікам, якія паспяхова і добрасумленна выконваюць свае працоўныя абавязкі, прадстаўляюцца ў першую чаргу перавагі і льготы ў галіне сацыяльна-культурнага і жыллёва-бытавога абслугоўвання. Такім работнікам прадстаўляецца таксама перавага пры павышэнні па рабоце.

40. За асобныя працоўныя заслугі работнікі універсітэта прадстаўляюцца ў вышэйстаячыя органы для ўзнагароды ордэнамі, медалямі, Ганаровымі граматамі, нагруднымі значкамі і да прысваення ганаровых званняў і звання лепшага работніка па дадзенай прафесіі.

41. Працоўныя калектывы прымяняюць за поспехі ў працы меры грамадскага заахвочвання, прадстаўляюць работнікаў для маральнага і матэрыяльнага заахвочвання; выказваюць свае адносіны па кандыдатурах, прадстаўленых да дзяржаўных узнагарод, устанаўліваюць дадатковыя льготы і перавагі за лік сродкаў, выдзеленых універсітэт.

Узнагароды аб'яўляюцца загадам рэктара па ўзгадненню з прафкомам студэнтаў і камітэтам камсамола і даводзяцца да ведама студэнцкіх груп (факультэта) на сходзе. Выпіска з загаду аб узнагародзе захоўваецца ў асабістай справе студэнта.

VII. АДКАЗНАСЦЬ ЗА ПАРУШЭННЕ ПРАЦОЎНАЙ І ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ.

43. Парушэнне працоўнай дысцыпліны, г. зн. невыкананне ці ненależнае выкананне па віне работніка ўскладзеных на яго працоўных абавязкаў, вядзе за сабой прымяненне мер дысцыплінарнага ці грамадскага ўздзеяння, а таксама прымяненне іншых мер, прадугледжаных дзейнічаючым заканадаўствам.

44. За парушэнне працоўнай дысцыпліны адміністрацыя універсітэта выкарыстоўвае наступныя дысцыплінарныя спагнанні:

а) заўвагу;

б) вымову;

в) строгую вымову;

г) перавод на ніжэйаплачваемую работу на тэрмін да трох месяцаў і змяшчэнне на ніжэйшую пасаду на такі ж тэрмін.

За сістэматычнае парушэнне працоўнай дысцыпліны, прагул без уважлівых прычын ці з'яўленне на рабоце ў нецвярозым стане работнік можа быць пераведзены на іншую, ніжэйаплачваемую працу ці пасаду на тэрмін, указаны ў абзацы I дадзенага падпункта.

д) звальненне.

Звальненне ў якасці дысцыплінарнага спагнання можа быць прыменена па ўзгадненню з прафсаюзным камітэтам выкладчыкаў і супрацоўнікаў за сістэматычнае невыкананне работнікам без уважлівых прычын абавязацельстваў, ускладзеных на яго працоўным дагаворам ці правіламі ўнутранага распарадку, калі да работніка раней прымяняліся меры дысцыплінарнага спагнання, за прагул (у тым ліку за адсутнасць на рабоце больш трох гадзін на працягу працоўнага часу) без уважлівых прычын, за з'яўленне на рабоце ў нецвярозым стане, а таксама за ўчыненне па месцу працы крадзяжу (у тым ліку дробнага) дзяржаўнай ці грамадскай маёмасці.

Прагулам лічыцца непрыход на работу без уважлівых прычын на працягу ўсяго працоўнага дня. Аднолькавым чынам лічацца прагульшчыкамі работнікі, якія адсутнічаюць на рабоце на працягу працоўнага дня без уважлівых прычын і да іх прымяняюцца тыя ж меры адказнасці, якія ўстаноўлены за прагул.

45. За прагул (у тым ліку за адсутнасць на рабоце больш трох гадзін на працягу рабочага дня) без уважлівых прычын, распіццё спіртных напіткаў ці з'яўленне ў нецвярозым стане - адміністрацыя вышэйшай навучальнай установы прымяняе адну з мер дысцыплінарнага спагнання, прадугледжаных у пункце 44 наступных правіл.

Рабочым і служачым, у якіх ёсць прагул без уважлівых прычын, чарговы адпачынак у адпаведным годзе змяншаецца на колькасць дзён прагула, пры гэтым водпуск не павінен быць менш двух працоўных тыдняў (12 працоўных дзён).

46. Дысцыплінарныя спагнанні прымяняюцца рэктарам, прарэктарам універсітэта па ўзгадненню з прафкомам і аб'яўляюцца загадам.

Адміністрацыя навучальнай установы мае права замест дысцыплінарнага спагнання перадаць пытанне аб парушэнні працоўнай дысцыпліны на разгляд працоўнага калектыву ці грамадскай арганізацыі.

47. Працоўныя калектывы праяўляюць строгую таварыскую патрабавальнасць да работнікаў, недобрасумленна выконваючых працоўныя абавязкі, прымяняюць да членаў калектыву за парушэнне працоўнай дысцыпліны меры грамадскага спагнання, перадаюць матэрыялы аб парушальніках працоўнай дысцыпліны на разгляд грамадскіх арганізацый, ставяць пытанні аб прымяненні да парушальнікаў працоўнай дысцыпліны мер уздзеяння, прадугледжаных заканадаўствам.

48. Да прымянення спагнання ад парушальніка працоўнай дысцыпліны павінны быць патрабаваны тлумачэнні ў пісьмовай форме. Адказ работніка даць тлумачэнне не можа служыць перашкодай для прымянення спагнання.

Дысцыплінарныя спагнанні прымяняюцца адміністрацыяй непасрэдна за выяўленнем правіннасці, але не пазней аднаго месяца з дня яго выяўлення, не ўлічваючы часу хваробы ці знаходжання работніка ў водпуску.

Дысцыплінарнае спагнанне не можа быць прыменена пазней шасці месяцаў з дня ўчынення правіннасці. Ва ўказаныя тэрміны не ўключаецца час вытворчасці па ўгалоўнай справе.

49. За кожнае парушэнне працоўнай дысцыпліны можа быць прыменена толькі адно дысцыплінарнае спагнанне.

50. Пры прымяненні спагнання павінна ўлічвацца цяжкасць правіннасці, абставіны, пры якіх яно здзейснена, папярэдняя праца і паводзіны работніка.

51. Загад аб прымяненні дысцыплінарнага спагнання з указаннем матываў яго прымянення, даводзіцца да ведама работніка, да якога было прыменена спагнанне, пад распіску ў трохдзённы тэрмін.

Загад у неабходных выпадках даводзіцца да свядомасці работнікаў навучальнай установы.

52. Калі на працягу года з дня прымянення дысцыплінарнага спагнання да работніка не будзе прыменена новае дысцыплінарнае спагнанне, то яно скасоўваецца.

Адміністрацыя па сваёй ініцыятыве ці па хадатайніцтву працоўнага калектыву можа выдаць загад аб зняцці спагнання не чакаючы канца года, калі работнік не дапусціў новага парушэння працоўнай дысцыпліны і пры тым праявіў сябе як добрасумленны работнік.

На працягу тэрміну дзеяння дысцыплінарнага спагнання меры заахвочвання, указаныя ў наступных правілах, да работніка не прымяняюцца.

53. Працоўны калектыў мае права зняць спагнанне датэрмінова да канца года з дня яго прымянення, а таксама ставіць пытанне аб датэрміновым зняцці дысцыплінарнага спагнання ці аб спыненні дзеяння іншых мер, якія прымяняюцца за парушэнне працоўнай дысцыпліны, калі член калектыва не дапусціў новага

(Працяг на стар. 4).

Працяг, пачатак на стар. 2, 3.).

парушэння дысцыпліны і праявіў сябе як добрасумленны работнік.

54. За парушэнне сваіх абавязкаў, вучэбнай дысцыпліны, правіл унутранага распарадку і сацыялістычнага супольнага жыцця да студэнтаў, аспірантаў, слухачоў падрыхтоўчага аддзялення можа быць прыменена адно з наступных дысцыплінарных спагнанняў:

а) заўвага;

б) вымова;

в) строгая вымова;

г) выключэнне з універсітэта.

Выключэнне з вышэйшай навучальнай установы студэнтаў і слухачоў падрыхтоўчага аддзялення праводзіцца з улікам думак прафкома студэнтаў назучальнай установы, а выключэнне з вышэйшай навучальнай установы непаўнагадовых студэнтаў, слухачоў падрыхтоўчага аддзялення праводзіцца, акрамя таго, са згоды раённай (гарадской) камісіі па справах непаўнагадовых.

Дысцыплінарныя спагнанні прымяняюцца непасрэдна пасля выяўлення правіннасці, але не пазней аднаго месяца з дня яго выяўлення (не ўлічваючы часу хваробы ці знаходжання студэнта, аспіранта, слухача падрыхтоўчага аддзялення на канікулах), яно не можа быць прыменена пазней шасці месяцаў з дня здзяйснення правіннасці. Калі студэнт, аспірант, на працягу года з дня прымянення дысцыплінарнага спагнання не будзе падвергнуты новаму дысцыплінарнаму спагнанню, то ён лічыцца не падвергшымся дысцыплінарнаму спагнанню.

55. У працоўныя кніжкі студэнтаў, аспірантаў, слухачоў падрыхтоўчага аддзялення, якія маюць працоўныя кніжкі, універсітэт уносіць запіс аб часе навучання на дзённым аддзяленні універсітэта без указання прычыны выключэння.

VIII. ВУЧЭБНЫ ПАРАДАК.

56. Вучэбныя заняткі ва універсітэце праводзяцца па раскладу згодна з вучэбнымі планамі і праграмамі, зацверджанымі ва ўстаноўленым парадку.

Для студэнтаў дзённай і вячэрняй форм навучання два разы ў год устанаўліваюцца канікулы агульнай працягласцю 7—10 тыдняў. Скарачэнне працягласці канікулаў, устаноўленых вучэбнымі планамі, не дапускаецца.

57. Вызваленне студэнтаў ад вучэбных заняткаў на работы, не звязаныя з вучэбным працэсам, не дапускаецца.

58. Вучэбны расклад складаецца на семестр і вывешваецца не пазней, чым за 10 дзён да пачатку кожнага семестра.

Для правядзення факультатыўных заняткаў складаецца асобны расклад. Нагрузка студэнтаў пры навучанні з адрывам ад вытворчасці ўсімі відамі вучэбных заняткаў, уключаючы факультатыўныя: на I—IV курсах — не больш 36 гадзін і на V—VI курсах — не больш 30 гадзін у тыдзень.

59. Працягласць акадэмічнай гадзіны — 40—45 хвілін. Перад пачаткам вучэбных заняткаў гучыць два званкі: першы даецца за дзве хвіліны да пачатку акадэмічнай гадзіны, другі званок абвяшчае аб пачатку заняткаў. Пасля заканчэння заняткаў даецца адзін званок. Пасля заканчэння акадэмічнай гадзіны заняткаў устанаўліваецца перапынак працягласцю 5—10 хвілін. На працягу вучэбнага дня — абедзены перапынак працягласцю не менш 40 хвілін.

60. Уваход студэнтаў ва аудыторыю пасля другога званка забараняецца да перапынку.

Пасля пачатку заняткаў ва ўсіх вучэбных і прылягаючых да іх памяшканнях павінны быць забяспечаны цішыня і парадак, неабходныя для нармальнага ходу вучэбных заняткаў. Недапушчальна перарываць вучэбныя заняткі, уваходзіць у аудыторыю і выходзіць з яе ў час іх правядзення.

61. Да пачатку вучэбных заняткаў (і ў перапынках паміж заняткамі) у аудыторыях, лабараторыях, вучэбных майстэрнях і кабінетах лабаранты падрыхтоўваюць неабходныя вучэбныя дапаможнікі і апаратуру.

62. Для правядзення практычных заняткаў у аудыторыях, лабараторыях, вучэбных майстэрнях кожны курс дзеліцца на групы. Састаў студэнцкіх груп устанаўліваецца загадам рэктара ў залежнасці ад характару практычных заняткаў.

63. У кожнай студэнцкай групе выбіраецца староста калектывам гэтай групы, які працуе ў цесным кантакце з прафгрупоргам і камсоргамі групы і падначальваецца непасрэдна дэкану факультэта, прадэканам у сваей групе ўсе яго распараджэнні і ўказанні.

У функцыі старасты групы ўваходзіць:

а) персанальны ўлік наведвання студэнтамі ўсіх відаў вучэбных заняткаў;

б) прадстаўленне дэкану факультэта кожны дзень рапарта аб няяўцы ці спазненні студэнтаў на заняткі з указаннем прычын спазнення;

в) нагляд за станам вучэбнай дысцыпліны ў групе на лекцыях і практычных занятках, а таксама за захоўваннем вучэбнага абсталявання і інвентару;

г) своечасовая арганізацыя атрымання і размеркавання сярод студэнтаў групы падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў;

д) паведамленне студэнтам аб змяненнях у раскладзе заняткаў дэканам факультэта;

е) назначэнне на кожны дзень у парадку чаргі дзяжурнага па групе;

ж) кантроль за своечасовым атрыманнем і выдачай стыпендыі студэнтам групы.

Распараджэнне старасты ў межах указаных вышэй функцый абавязковае для ўсіх студэнтаў групы.

64. У кожнай групе вядзецца журнал устаноўленай формы, які захоўваецца на факультэтах і штодзённа, перад пачаткам заняткаў, выдаецца старасце, які адзначае ў ім прысутнічаючых і адсутнічаючых на занятках студэнтаў.

IX. ПАРАДАК У ПАМЯШКАННЯХ.

65. Адказнасць за добраўпарадкаванасць у вучэбных памяшканнях (наяўнасць спраўнай мэблі, вучэбнага абсталявання, падтрымка нармальнай тэмпературы, асвятленне і інш.). нясе прарэктар па адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце універсітэта.

За спраўнасць абсталявання ў лабараторыях і кабінетах, за гатоўнасць вучэбных дапаможнікаў да заняткаў адказваюць загадчыкі лабараторый.

66. **У памяшканнях універсітэта забараняецца:**

а) знаходжанне ў паліто, галаўных уборах;

б) шумныя размовы, хаджэнне па калідорах у час заняткаў;

в) курэнне;

г) распіццё спіртных напіткаў.

Адміністрацыя універсітэта абавязана забяспечыць ахову навучальнай установы, захаванне абсталявання, інвентару і іншай маёмасці, а таксама падтрымку неабходнага парадку ў вучэбных і бытавых памяшканнях.

Ахова памяшканняў, маёмасці і адказнасць за іх проціпажарны і санітарны стан ускладаецца загадам рэктара на канкрэтных асоб

ж) прарэктар па навуковай рабоце прымае наведвальнікаў у аўторак і пятніцу з 14.00 да 17.00 гадзін;

г) прарэктар па завочнаму навучанню прымае наведвальнікаў з 14.00 да 17.00 у сераду, у суботу з 9.00 до 12.00 гадзін;

д) прарэктар па адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце прымае наведвальнікаў: у сераду з 10.00 да 12.00 і ў пятніцу з 10.00 да 16.00;

е) дэканы факультэтаў і іх намеснікі ўстанаўліваюць часы прыёму прафесараў, выкладчыкаў і студэнтаў у залежнасці ад часу работы факультэтаў.

68. Ключы ад памяшканняў вучэбнага будынку, а таксама ад аудыторый, лабараторый і кабінетаў павінны знаходзіцца ў дзяжурнага работніка аховы навучальнай установы і выдавацца па спісу, устаноўленаму прарэктарам па адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце.

69. Правілы ўнутранага распарадку вывешваюцца ў падраздзяленнях універсітэта на відным месцы.

ПРАВІЛЫ ЎНУТРАНАГА РАСПАРАДКУ ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя ЯНКІ КУПАЛЫ

КНІЖНЫ АГЛЯД

Фонд нашай бібліятэкі папоўніўся новымі кнігамі, прысвечанымі працэсам перабудовы і дэмакратызацыі.

На працягу гэтага тыдня (да 13 студзеня) з імі можна пазнаёміцца на выстаўцы новых выданняў, арганізаванай у справачна-інфармацыйным аддзеле.

Абалкін Л. І. САВЕЦКАЕ ГРАМАДСТВА: РЭВАЛЮЦЫЙНАЕ АБНАЎЛЕННЕ. — М., Прафвыд., 1989.

Кніга ўяўляе сабой інтэрвью Л. І. Абалкіна выдавецтву ВЦСПС «Прафвыдавецтва».

Што такое перабудова, ці есць у яе ворагі? Хто яны? На гэтыя і іншыя пытанні можна знайсці адказ у кнізе.

«ЛЕНІНСКАЯ ІДЭЙНА-ТЭАРЭТЫЧНАЯ СПАДЧЫНА І ПЕРАБУДОВА» — М., Палітвыдавецтва, 1989.

У кнізе, якая ўяўляе сабой вучэбны дапаможнік для слухачоў сістэмы палітычнай адукацыі раскрываецца змест ленінскай канцэпцыі сацыялізму і яе значымасць для практыкі сучаснай перабудовы ў нашым грамадстве.

Асобныя главы дапаможніка прысвечаны перабудове грамадскіх зносін, развіццю на сучасным этапе ленінскай тэорыі нацыянальных зносін, рэформе палітычнай сістэмы савецкага грамадства і іншым сучасным праблемам нашага часу.

ПРАВА І ПАСКАРЭННЕ САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАГА РАЗВІЦЦЯ (пад рэд. М. У. Сторажава —Мінск, Навука і тэхніка, 1989).

У зборніку змешчаны артыкулы, якія высвятляюць праблему прававога забеспячэння перабудовы: законнасць як фактар паскарэння сацыяльна-эканамічнага развіцця; роля прававой культуры ў актывізацыі чалавечага фактара і інш.

ПЕРАБУДОВА КІРАВАННЯ ЭКАНОМІКАЙ ПРАДПРЫЕМСТВА. — М., Эканоміка, 1989.

У кнізе асвятляюцца асноўныя напрамкі рэформы кіравання эканомікай. Значная ўвага ўдзелена пытанням развіцця гаспадарчага разліку, планавання, арганізацыі ўліку і кантролю, перабудове арганізацыі работы кіраўніка.

У. М. Сяргееў. ГЛЕДЗЯЧЫ Ў ЗАЎТРАШНІ ДЗЕНЬ. — М., Асвета, 1989.

На пэўных прыкладах у кнізе расказваецца аб асноўных праблемах рэалізацыі курса СССР на перабудову і паскарэнне сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця краіны, аб ролі маладога пакалення ў вырашэнні гэтых задач.

ХРЭСТАМАТЫЯ ПА ГІСТОРЫІ КПСС (у 2-х тамах) — М., Выдавецтва палітычнай літаратуры, 1989. (пад рэд. У. У. Жураўлёва, і У. І. Зубарава).

Хрэстаматыя змяшчае вялікі даведачны матэрыял аб з'ездах і канферэнцыях КПСС, складзе кіруючых партыйных органаў, каментарыі.

Аўтары спрабавалі адыйсці ад традыцыйнай формы выкладання гісторыка-партыйнага матэрыялу. Дакументы падабраны такім чынам, каб паказаць неадназначнасць гістарычных працэсаў, прывесці розныя погляды на развіццё рэвалюцыйнага руху ў Расіі.

Я. ТАЮРСКАЯ,
старшы бібліограф.

ГЭТА ЦІКАВА

Добра сказаў шэкспіраўскі Гамлет: «Есть многое на свете, друг Горацио, что и не снилось нашим мудрецам».

Аказваецца, існуюць участкі Зямлі, якія шкодна дзейнічаюць на наша здароўе. Эксперыментальна даказана, што ўся Зямля, быццам бы мерыдыянамі і паралелямі, размалявана геабіялагічнай сеткай так званых «ліній Хартмана», якія праходзяць з поўначы на поўдзень на адлегласці каля 2 м адзін ад аднаго, і з усходу на захад — праз кожныя 2,5 м. Такім чынам, наша жыллё, рабочае месца падзелены на нябачныя прамавугольнікі 2х2,5 м, абмежаваныя чатырма «вугламі» — месцамі перасячэння ліній. Людзі значную частку свайго жыцця праводзяць у гэтых «скрыжаваннях», яны рана ці позна хранічна захворваюць, у іх развіваюцца пастаянныя галаўныя болі, бяссонніца, пагаршэнне памяці, скачкі ціску, рэўматызм, нават туберкулёз і анкалагічныя захворванні. Сутнасць з'явы пакуль што не высветлена, ды нам з вамі яна і не патрэбна: галоўнае, як вызначыць гэтую сетку!

Па рэцэпту балгарскага спецыяліста У. Мілева, прывяжыце на нітку вялікае кальцо ці груз (з немагнітнага матэрыялу) такой формы, каб можна было назіраць яго рух. Сам Мілеў карыстаецца вялікай янтарнай бусінай, можна выкарыстоўваць таксама медны бранзалет. Спачатку абследуйце ложкі і працоўнае месца, павольна павадзіце над імі сваёй прыладай. Трапіўшы на лінію Хартмана груз пачне раскачвацца, а там, дзе яны перасякаюцца, прыйдзе ў рух. Унутры сеткі ён нерухомы. Паколькі ўсе ніткі кручаныя, перад пачаткам работы неабходна даць вашай прыладзе прыйсці ў раўнавагу — няхай пакісіць, пакуль не супакоіцца. Вашы ложак і пісьмовы стол павінны стаяць унутры прамавугольніка, так, каб яны не пападалі на лініі і тым больш — на перасячэнні. Такім чынам абследуйце ўсё сваё жыллё. Даследаванне праводзіцца ў спакойным стане. Можа атрымаецца не адразу. Паўтарыце даследаванне ў розныя дні, у розны час сутак. Пасачыце за паводзінамі хатніх жывёл: сабакі ніколі не кладуцца на «скрыжаванне», а кошкі — наадварот...

Калі ў вашай мясцовасці ёсць чалавек, які можа з дапамогай рагулькі ці рамкі знайсці месца, дзе неабходна капаць калодзеж, то звярніцеся да яго за дапамогай: выявіце сетку і таксама даведайцеся, ці не знаходзіцца ваша хата на падземным патоку. Спаць у русле такога патоку, асабліва ў месцы зліцця двух жылаў падземных вод, таксама шкодна як і на перасячэнні ліній Хартмана.

Некаторыя вучоныя лічаць, што можна нейтралізаваць шкоднае ўздзеянне перасячэння ліній, калі пакласці пад ложак на скрыжаванне люстэрка сцяклом да падлогі, мармуровую пласціну, скрыначку з глінай, нават некалькі вязанак часнаку ці цыбулі...

(«Крестьянка» № 11 — 1989.).

ВЫБІРАЕМ «КАРАЛЕВУ»

20 студзеня у 19.00 ў памяшканні абласнога драматычнага тэатра адбудзецца фінал гарадскога конкурса прыгажосці. 16 прэтэндэнтак будуць аспрэчваць права на званне «Каралева прыгажосці Гродна — 90», «Першая Віцэ-міс», «Другая Віцэ-міс», «Міс-фота» і на прыз сімпатый гледачоў.

Гасцямі гродзенцаў у гэты вечар будуць і вядомыя беларускія выканаўцы Юлія Скараход, Уладзімір Кудрын, група пластычнай танцавальнай імправізацыі «Загад» і іншыя артысты эстрады.

Спонсары конкурса — вытворча-трыкотажнае аб'яднанне «Радуга», польская і італьянская фірмы.

Білеты — у касе аблдрамтэатра.

Наш адрес:
230023, г. Гродно,
ул. Ожешко, 22, комн. 336,
тел. 44-85-75

Газета выходит еженедельно

Гродненская областная укрупненная типография
ул. Полиграфистов, 4.

Тираж 2000 экз.
АИ 05003. Зак. 183.

Редактор
Л. С. ЗАСЕЛЬСКАЯ